# [У Беларусі створаны арганізацыйны камітэт для падрыхтоўкі і правядзення XXVIII Міжнароднага форуму па інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогіях ТІБО-2022]

Адпаведнае распараджэнне 10 снежня падпісаў Прэм'ер-міністр Беларусі Раман Аляксандравіч Галоўчанка.

Старшынёй аргкамітэта прызначаны міністр сувязі і інфарматызацыі Канстанцін Канстанцінавіч Шульган.

У склад арганізацыйнага камітэта ўвайшлі прадстаўнікі міністэрстваў, ведамстваў, асацыяцый і іншых арганізацый.

Створанаму аргкамітэту даручана распрацаваць і зацвердзіць канцэпцыю XXVIII Міжнароднага форуму па інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогіях ТІБО-2022. Павінна быць забяспечана скаардынаваная работа па своечасоваму і якаснаму фарміраванню экспазіцыі, падрыхтоўцы і правядзенні праграмы дзелавых мерапрыемстваў форуму.

Даты правядзення вызначаны з 24 па 27 мая 2022 г. у г. Мінску.

---

**Source URL:** *https://mpt.gov.by/news/16-12-2021-7622*